4. Ряд видов труда требует специальной физической подготовленности, которая может быть обеспечена только специфическими средствами и методами физической подготовки.

5. В современном производстве в связи с научно-техническим прогрессом наблюдается тенденция смены профессий у трудящихся. Хорошая общая физическая подготовленность расширяет возможности для соответствующей адаптации и овладения новыми профессиями.

Главной целью внедрения физической культуры в систему НОТ и трудовой деятельности в обществе является содействие повышению производительности труда на базе укрепления здоровья и всестороннего гармонического физического развития человека.

***Нямкова Л.М.***
*Філіял УА «БДЭУ» (Бабруйск)*

## МЯСТЭЧКА ЯК ЦЭНТР НЕЦЭХАВОЙ ВЫТВОРЧАСЦІ І ГАНДЛЮ У XVII-XVIII СТАГОДДЗЯХ

Большасць беларускіх мястэчкаў узнікла ў XVI – пачатку XVII ст. Калі ў XVI ст. іх на Беларусі налічвалася каля трохсот, то ў канцы XIX ст. ў нашым краі было 464 мястэчкі, дзе пражывала 679 тысяч чалавек. Яны падзяляліся на тры групы: дзяржаўныя (каралеўскія), прыватнаўласніцкія і царкоўныя. Значная колькасць местачкоўцаў жыла з раместваў і промыслаў. Напрыклад, у 1620 годзе 32 % жыхароў мястэчка Койданава былі рамеснікамі – кавалямі, слесарамі, бондарамі, ганчарамі, шаўцамі, краўцамі, рэзнікамі ( усяго каля 20 спецыяльнасцяў). У мястэчке Косаве ў першай палове XVII стагоддзя 24 % насельнікаў рамеснічалі. У Скідалі, Смаргоні, Беліцы, Адэльску гэтыя лічбы складалі адпаведна 21, 20, 19 і 6 %. Смаргонь, акрамя гэтага, славілася сваімі адмысловымі майстрамі, у ей працавалі рамеснікі ажно 24 спецыяльнасцяў.

1. У некаторых прыватнаўласніцкіх мястэчках іх уладальнікі-магнаты ўзводзілі невялікія прамысловыя прадпрыемствы. Напрыклад, у Лебедзеве і Быстрыцы працавалі рудні, у Радашковічах дзейнічала васкабойня, у Волме – паперня, а ў Цяпіне, Іўі, Любчы, Бялынічах, Лоску, Заслаўі нават былі друкарні. Чашнікі ж былі адметныя тым, што тут будаваліся стругі – гандлевыя судны. Зараджэнне мануфактур на Беларусі таксама самым цесным чынам звязана з мястэчкамі. Першая з іх з'явілася ў 1635 годзе ў мястэчку Урэчча – гэта была гута. Прадпрыемства пастаўляла на мясцовы і замежны рынак аконнае і каляровае шкло, крышталевыя і звычайныя люстры, разнастайны посуд. У першай палове XVIII ст. на Беларусі з'явіліся даволі буйныя мануфактуры, а іхняя прадукцыя была шырока вядома далека ад месцаў вытворчасці. Сярод іх фаянсавая мануфактура ў мястэчку Свержань, суконная фабрыка Бярновіча ў мястэчку Бабоўня, у Ружанах працавалі суконная і палатняная фабрыкі.

Работнікамі былі мяшчане мястэчка і жыхары навакольных весак. Трапіўшых на мануфактуру прыгонных, называлі "людзі", "людзі фабрычныя" ці "хлопцы". Яны дапамагалі майстрам і выконвалі нізкакваліфікаваную працу. Летні рабочы дзень працягваўся 10 гадзін. Майстры і хлопцы павінны былі "добра працаваць, не піць, не чыніць сварак, ва ўсім падпарадкоўвацца дыспазітару" (адміністратару) [Ганецкая І. Свержанская фаянсавая мануфактура XVIII ст. // Беларускій гістарычны часопіс. 2004. № 12.] Прадпрыемствы не толькі забяспечвалі патрэбы магнацкага двара, але і прапаноўвалі значную частку сваіх вырабаў на продаж. Атрыманыя ад рэалізацыі тавару грошы ішлі, перш за ўсе, на патрэбы вытворчасці. Усе работнікі, у тым ліку часовыя, атрымлівалі за сваю працу плату ў грашовай форме, што з'яўлялася важнай характарыстыкай эканамічнай сутнасці прадпрыемства. Майстрам таксама налічваўся заробак, які залежаў ад аб'ему працы. Не выключна, што пазней прынцыпы аплаты змяніліся, і майстры пачалі атрымліваць фіксаваны заробак (strawne, "страўныя"). Форма аплаты магла быць змешанай. Самым вялікім быў заробак майстра-іншаземца, што было правілам на ўсіх прыватных мануфактурах. Адміністратар і пісар, а таксама "людзі" атрымлівалі "страўныя" – пастаянныя выплаты, якія ўстанаўліваліся князем ці княжацкімі кантралерамі. Выплата "страўных" залежала ад выкананай працы і кваліфікацыі, што стымулявала работнікаў старанна выконваць свае абавязкі. Напрыклад, на Свержанскай фаянсавай мануфактуры з 13 па 20 мая 1753 г. агульная сума "страўных" складала 35 злотых, з якіх 11 было выплачана дыспазітару і пісару, а 24 – "людзям"(усяго 12 чалавек), г.зн. ў сярэднім па 2 злотыя на аднаго ў тыдзень. Памочнік гарадскога рамесніка ў другой палове XVIII стагоддзя атрымліваў усяго паўзлотага ў тыдзень, а пастух у мястэчку 2,2 злотыя ў тыдзень.

Неад'емнай прыналежнасцю мястэчкаў з'яўляліся заезныя двары і корчмы. У некаторых з іх гэты промысел займаў амаль ці не цэнтральнае месца. Так, у Радашковічах на 96 дамоў былі 63 заезныя дамы і карчмы, у Лебедзеве гэтыя суадносіны складалі 149 і 48, Косаве – 79 і 26, Паставах – 42 і 29, Відзах – 25 і 15. Такая колькасць піцейных устаноў тлумачылася тым, што ў мястэчках, дзе быў развіты гандаль збожжам, выраблялася даволі шмат алкагольных напояў. Вінакурэнне – дазвалялася толькі землеўладальнікам (права прапінацыі). Гэтая вытворчасць не патрабавала вялікіх затрат. Уся праца, звязаная з будаўніцтвам і рамонтам вінакурняў (бровараў), ў другой палове XVII – першай палове XVIII ст. выраблялася галоўным чынам у выглядзе сялянскіх павіннасцей. Адзінымі затратамі, якія нёс феадал у сувязі з развіццем гэтай вытворчасці, былі расходы на набыцце абсталявання і аплату вінакурам. Напрыклад, на Крычаўскім бровары на працягу сутак выраблялі 110 вёдраў гарэлкі, вінакурня ва Урэччы давала прыкладна 2700 л гарэлкі ў суткі. Не было цяжкасці і ў збыце моцных. Асноўнымі яе спажыўцамі з'яўляліся ўласныя сяляне. Жадалі яны гэтага ці не, яны абавязаны былі купляць алкагольныя напоі толькі ў свайго гаспадара. Натуральна, вінакурэнне з'яўлялася адным з найгалоўнейшых прыбытковых артыкулаў буйных землеўладальнікаў. Толькі арэнда корчмаў

складала 37 % прыбытку вялікай Магілеўскай эканоміі, 26 % – Гомельскага староства. Вінакурні існавалі пры корчмах, актыўнаму ўжыванню якіх безумоўна спрыялі рэгулярныя таргі і кірмашы, што праходзілі ў мястэчках.

Местачковы гандаль трымаўся на яўрэях. Прыкладна з другой паловы XVI ст. яны пачалі адыгрываць даволі значную ролю ў эканамічным жыцці тагачаснага грамадства. У некаторых мястэчках яўрэі складалі да 50 % насельніцтва. Таму найбольш адметнай рысай жыцця любога тагачаснага мястэчка былі рэгулярныя таргі, якія праводзіліся адзін-два разы ў тыдзень. Так, кароль польскі і вялікі князь літоўскі Жыгімонт III Ваза, сваім прывілеем ад 14 сакавіка 1613 года надаючы Жыровіцам статут мястэчка, асабіста прызначыў у ім два штотыдневыя таргі – па чацвяргам і нядзелям. Некаторыя мястэчкі ў часы Рэчы Паспалітай атрымлівалі права праводзіць штогадовыя кірмашы, якія звычайна прымяркоўваліся да таго ці іншага рэлігійнага свята. Напрыклад, буйныя конскія кірмашы ў Міры адбываліся ў дні святога Мікалая – 9 мая і 6 снежня. Кірмашы адыгрывалі настолькі важную ролю ў эканамічным жыцці той ці іншай мясцовасці, што некаторыя магнаты на дзень іх правядзення нават вызвалялі сваіх сялян ад абавязковай паншчыны. Так, сяляне маёнтка Ражанка ў пачатку XVIII стагоддзя кожны тыдзень у аўторак мелі вольны дзень для гандлю. На штотыдневых таргах і кірмашах рэалізоўвалі звыш 50 найменняў тавару. Асноўнымі былі жыта, пшаніца, ячмень, авёс, грэчка, агуркі, капуста, каноплі, пянька, хмель, алей, жывёла, птушка, яйкі, мяса-малочныя прадукты, мед, піва, гарэлка, селядцы, соль, жалеза, цэгла і інш.

***Павлова Л.П., канд. пед. наук, доцент***
*Филиал УО «БГЭУ» (Бобруйск)*

## СОЦИОКУЛЬТУРНЫЙ И ИНТЕРАКТИВНЫЙ ПОДХОДЫ К ОБУЧЕНИЮ СТУДЕНЧЕСКОЙ МОЛОДЕЖИ В УСЛОВИЯХ РЫНОЧНОЙ ЭКОНОМИКИ

Проведенные нами исследования позволили выявить существенную роль культуры, общественного сознания и менталитета в историческом процессе развития общества в условиях рыночной экономики. Именно в период перехода к рынку повышается научный статус самого понятия культура. Известно, что успехи и неудачи общества зависят от нашей деятельности, причем не только от ее интенсивности, но и от тех способов деятельности, которые предоставляет нам культура социума.

Культура и социальные отношения вступают в противоречие с инновациями, которые их изменяют, создавая новые социальные отношения. Возможность возникновения социокультурного противоречия связана с тем, что изменения культуры и изменения социальных отношений подчиняются разным закономерностям. В обществе допустимы только такие социальные отношения, которые могут обеспечить необходимый для общества уровень гармонии, тогда